# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 11 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.**

[мы ва́ртыј’а н’аты́м, хто бол’ш саб’э́ нагро́п, а тым – хто бол’ш а д̄аў пал’у́цку л’у́дз’ам]

*За кожнае правільна затранскрыбіраванае фанетычнае слова – 0,5 бала.*

*Заўвага:* Гукі могуць перадавацца на пісьме рознымі літарамі або спалучэннямі літар: гук ***й*** можа – ***й, j***; падоўжаныя зычныя – дзвюма літарамі або літарай з рыскай зверху ***[с̄]***; фрыкатыўны гук ***г*** – літарай ***г*** або лацінскай літарай ***ɣ***; афрыкаты ***дз, дз’, дж*** – спалучэннем ***д, з, ж*** і інш.

**Заданне 2.**

| Слова | Магчымае тлумачэнне | Магчымыя адпаведнікі |
|---|---|---|
| **Стартап** | камерцыйны праект, заснаваны на якой-небудзь ідэі, які патрабуе фінансавання для развіцця | пачаткапраект, новаідэя, новапраект і пад. |
| **Хэдлайнер** | аўтар загалоўкаў; герой загалоўкаў, вядучы выканаўца | брэндапрадстаўнік, першавыканаўца і пад. |
| **Білборд** | рэкламны шчыт; знешняя рэклама ўздоўж трас, вуліц | дарожнашыльда, дарожнашчыт, праезнашчыт і пад. |

*За кожнае правільнае тлумачэнне значэння – 1 бал, за максімальна дакладны адпаведнік – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *вантроба* | ‘замучыць, загубіць нападкамі, ганеннем’ | ***з’есці з вантробамі*** |
| *кот* | ‘вельмі мала; пра нязначную колькасць каго-, чаго-н.’ | ***як кот наплакаў*** |
| *нос* | ‘з вялікім апетытам і прагна (есці)’ | ***аж нос гнецца*** |
| *рахунак* | ‘помсціць каму-н., расквітацца з кім-н.’ | ***зводзіць рахункі*** |
| *рука* | ‘даходзіць да крайняга здзіўлення, недаўмення; не ведаць, як выйсці з цяжкага становішча’ | ***разводзіць рукамі*** |
| *хамут* | ‘рашуча не пагаджацца, упарціцца’ | ***біць у хамут*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| *разьба* | ***разьбяр*** | *рэпрэзентаваць* | ***рэпрэзентант*** |
| *Коста-Рыка* | ***костарыканец*** | *пляткарыць* | – |
| *стварэнне* | – | *алгебра* | ***алгебраіст*** |
| *Зімбабвэ* | ***зімбабвіец*** | *інтэлект* | – |
| *бег* | – | *рэзаць* | ***рэзчык / рэзальшчык*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал. За лішняе слова адымаецца 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | ***Назоўнік ніякага роду:***<br>журы, Нарач, Гобі, прамяні | журы |
| 2 | ***Прыметнік, які мае нулявы суфікс:***<br>падталы, чорнабароды, яркі, матчын | чорнабароды |
| 3 | ***Займеннік, у якога корань складаецца з аднаго гука:***<br>вамі, табой, яна, нешта | вамі |
| 4 | ***Складаны лічэбнік:***<br>абедзве, дваццаты, сямнаццаць, паўтара | абедзве |
| 5 | ***Дзеяслоў, у якім канчатак 1-й асобы адзіночнага ліку складаецца з аднаго зычнага гука:***<br>сыпаць, веяць, выдаць, пераядаць | выдаць (выдам) |
| 6 | ***Дзеепрыслоўе, утворанае ад дзеяслова II спражэння:***<br>купаючыся, абуўшыся, крычучы, размяркоўваючы | крычучы |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| № сказа | Прыкладнае тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Прыкладны варыянт выпраўленага сказа |
|---|---|---|
| 1 | Памылка звязана з афармленнем аднародных членаў сказа. Злучнік ***не толькі…, але і*** звязвае аднародныя члены сказа. Значыць першая частка злучніка (***не толькі…***) павінна стаяць перад першым аднародным членам сказа, а другая частка (***але і…***) – перад другім | Іван Іванавіч Насовіч лічыцца зоркай першай велічыні ў гісторыі ***не толькі*** беларускай філалогіі, ***але і*** этнаграфіі. |
| 2 | Няма памылак | – |
| 3 | Памылка звязана з афармленнем аднародных членаў сказа з залежнымі словамі. Залежныя словы павінны мець граматычную сувязь з кожным з аднародных выказнікаў | Беларусы ***ганарацца сваімі дзяржаўнымі сімваламі і паважаюць іх***. |

| | | |
|---|---|---|
| **4** | Памылка звязана з ужываннем ступені параўнання прыметніка. Пры адсутнасці параўнання, а таксама ў тым выпадку, калі яно не падразумяваецца, трэба выкарыстоўваць найвышэйшую ступень параўнання прыметнікаў | Род Вайніловічаў – адзін ***з самых старажытных*** шляхецкіх родаў Беларусі. |
| **5** | Памылка звязана з каардынацыяй дзейніка і выказніка: пры дзейніку ***цэнтр*** выказнік павінен мець форму мужчынскага роду. У спалучэнні ***цэнтр “Зубраня”*** назва цэнтра з’яўляецца прыдаткам | Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы ***цэнтр*** “Зубраня” ***расчыніў*** свае дзверы ў 1969 годзе. |
| **6** | Памылка звязана з афармленнем дзеепрыметнікавага звароту. Дзеепрыметнікавы зварот не разрываецца | Па выніках ***праведзенага крытыкамі*** апытання, найлепшай беларускай кінастужкай лічыцца мастацкі фільм рэжысёра Віктара Турава “Я родам з дзяцінства”.<br>АБО<br>Па выніках апытання, ***праведзенага крытыкамі***, найлепшай беларускай кінастужкай лічыцца мастацкі фільм рэжысёра Віктара Турава “Я родам з дзяцінства”. |

*За кожны правільна запоўнены радок (у тым ліку за ўказанне на адсутнасць памылкі) – 1 бал (0,5 бала за выяўленне і 0,5 бала за тлумачэнне памылкі).*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Калі пацягнуліся, у больш шырокіх месцах, асаковыя і трысняговыя зараснікі, Асоль зусім была згубіла з вачэй *(поля зроку)* пунсовае *(ярка-чырвонае)* зіхаценне *(блісканне)* ветразяў *(парусоў)*, але, абабегшы *(абегшы)* лукавіну *(выгін, выгіб)* плыні *(цячэння)*, зноў убачыла, як яны паважна і няўхільна плывуць *(сплываюць)* прэч. Раз яна азірнулася, і лясная грамада з яе стракатасцю, якая пераходзіць ад дымных слупоў святла ў лістоце да цёмных расколін дрымучага змроку, глыбока ўразіла дзяўчынку. На імгненне *(момант)* спалохаўшыся *(спужаўшыся)*, яна ўспомніла зноў пра караблік і пабегла з усіх сіл *(усяе сілы)*.

*За кожную памылку перакладу (лексічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

**Выбраны раздзел “Я не ўключаю верш у раздзел “Санеты”.**

*Ацэнка за заданне складаецца з трох кампанентаў: аргументы за неўключэнне верша ў раздзел “Санеты”; вызначэнне раздзела, у які трэба ўключыць верш; аргументы за ўключэнне верша ў раздзел “Актавы”.*

| Сістэма ацэньвання | Колькасць балаў |
|---|---|
| *Аргументы за неўключэнне верша ў раздзел “Санеты”* | |
| *Прыведзены 2 істотныя аргументы (напрыклад, верш складаецца не з 14 радкоў, не мае вызначанай рыфмоўкі (абба абба ввг дгд ці абаб абаб ввг ддг), не мае “замка” і “ключа)* | *2* |
| *Прыведзены 1 істотны аргумент* | *1* |
| *Істотныя аргументы не прыведзены* | *0* |
| *Вызначэнне раздзела, у які трэба ўключыць верш* | |
| *Выбраны варыянт “буду ўключаць верш у зборнік у раздзел”, дапісаны раздзел “Актавы”* | *1* |
| *Выбраны варыянт “буду ўключаць верш у зборнік у раздзел”, але не вызначаны ці няправільна вызначаны раздзел* | *0,5* |
| *Аргументы за ўключэнне верша ў раздзел “Актавы”* | |
| *Прыведзены 2 істотныя аргументы (напрыклад, верш складаецца з 8 радкоў, у ім радкі рыфмуюцца асобым чынам: абабабвв).* | *2* |
| *Прыведзены 1 істотны аргумент* | *1* |
| *Істотныя аргументы не прыведзены* | *0* |

**Заданне 9.**

| | | |
|---|---|---|
| **А** | 2 | Кузьма Чорны |
| **Б** | 5 | Васіль Быкаў |
| **В** | 3 | Уладзімір Караткевіч |
| **Г** | 1 | Іван Шамякін |
| **Д** | 7 | Янка Брыль |
| **Е** | 4 | Ядвігін Ш. |

*За кожнае правільнае суаднясенне – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне аўтара – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка за заданне складаецца з чатырох кампанентаў: правільнасці вызначэння аўтара і назвы твора; правільнасці вызначэння ілюстрацый; ацэнкі прэамбулы; ацэнкі загалоўка прэамбулы.*

*Максімальная колькасць балаў па кампанентах:*

| Кампанент | Максімальная колькасць балаў |
|---|---|
| *Правільнасць вызначэння аўтара і назвы твора* | *1* |
| *Правільнасць вызначэння ілюстрацый* | *1* |
| *Ацэнка прэамбулы* | *4* |
| *Ацэнка загалоўка прэамбулы* | *1* |

*За правільнае вызначэнне аўтара (Іван Дамінікавіч Луцэвіч (Янка Купала) – 0,5 бала, назвы твора (“Магіла льва”) – 0,5 бала.*

*За кожную правільна вызначаную ілюстрацыю (№ 2,5) – 0,5 бала.*

*Ацэнка прэамбулы і загалоўка:*

*за кожны правільна вызначаны эпізод (№ 2 – Наталька ідзе за баярынам (“Яна ішла за ім, як цень”), № 5 – забойства Машэкі) – 0,5 бала;*

*за наяўнасць ацэнкі перадачы ў дзвюх ілюстрацыях аўтарскай задумы – 1 бал;*

*за аргументацыю сваёй ацэнкі – 1 бал;*

*за колькасць слоў у прэамбуле да 150 – 1 бал*

*За наяўнасць крэатыўнага загалоўка – 1 бал.*